ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 37 (1035) ● ЧАЦВЕР, 20 снежня 1973 г. ● Цана 2 кап. ● Газета выдаецца з 1935 г.

## У ПАЛЁЦЕ — «САЮЗ-13»!

### ПАВЕДАМЛЕННЕ ТАСС

У адпаведнасці з праграмай даследаванняў у калязямной касмічнай прасторы 18 снежня 1973 года ў 14 гадзін 55 мінут па маскоўскаму часу ў Савецкім Саюзе ажыццёўлен запуск касмічнага карабля «Саюз-13».

Касмічны карабель пілатуе экіпаж у саставе камандзіра карабля маёра Клімука Пятра Ільіча і бортінжынера Лебедзева Валянціна Вітальевіча.

Праграма арбітальнага палёту прадугледжвае: правядзенне астрафізічных назіранняў зорак ва ультрафіялетавым дыяпазоне з дапамогай устаноўленай на борце сістэмы тэлескопаў «Арыён-2»;

спектразанальную здымку асобных участкаў зямной паверхні з мэтай атрымання даных для вырашэння народнагаспадарчых задач;

працяг комплекснай праверкі і выпрабаванняў бартавых сістэм касмічных караблёў «Саюз»;

далейшую адпрацоўку працэсаў ручнога і аўтаматычнага кіравання, а таксама метадаў аўтаномнай навігацыі ў розных рэжымах палёту.

З экіпажам карабля «Саюз-13» падтрымліваецца ўстойлівая радыё- і тэлевізійная сувязь.

Самаадчуванне касманаўтаў таварышаў Клімука і Лебедзева добрае, бартавыя сістэмы працуюць нармальна. Касманаўты Клімук і Лебедзеў распачалі выкананне намечанай праграмы палёту.

55 ГОД КАМПАРТЫІ БЕЛАРУСІ

# ПА ГЕРАІЧНАМУ ШЛЯХУ

30 снежня 1973 года спаўняецца 55 год з дня ўтварэння Камуністычнай партыі Беларусі як састаўной часткі КПСС.

Гэтая гістарычная падзея ў жыцці працоўных Беларусі азначала новы этап у партыйным будаўніцтве, садзейнічала далейшаму пашырэнню і ўмацаванню сувязей партыі з масамі, усталяванню дыктатуры пралетарыяту і правядзенню сацыялістычных пераўтварэнняў з улікам мясцовых асаблівасцей.

Утварэнне Кампартыі Беларусі, якое непарыўна звязана з утварэннем Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі, з'явілася вынікам перамогі Вялікай Кастрычніцкай Сацыялістычнай рэвалюцыі і няўхільнага ажыццяўлення ленінскай нацыянальнай палітыкі.

Уся практычная работа па ўтварэнню КПБ і ўтварэнню БССР праводзілася пад кіраўніцтвам ЦК РКП(б) Паўночна-Заходнім абласным камітэтам партыі і мясцовымі партыйнымі арганізацыямі Беларусі.

Практычна гэтыя пытанні былі вырашаны на VI Паўночна-Заходняй абласной канферэнцыі РКП(б), якая адбылася ў Смаленску 30—31 снежня 1918 года.

На канферэнцыі было вырашана лічыць VI Паўночна-Заходнюю абласную партканферэнцыю Першым з'ездам Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі. Канферэнцыя аднагалосна па прапанове А. Ф. Мяснікова прыняла наступную пастанову: «Маючы на ўвазе, што на чарговай VI Паўночна-Заходняй канферэнцыі РКП (бальшавікоў) прадстаўлены поўнасцю ўсе камуністычныя арганізацыі, якія знаходзяцца на тэрыторыі Беларусі, канферэнцыя аб'яўляе сябе Першым з'ездам Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларускай Рэспублікі». Гэта рашэнне азначала арганізацыйнае афармленне Камуністычнай партыі Беларусі як састаўной неад'емнай часткі РКП(б).

Уся работа Першага з'езда КП(б)Б і прынятыя ім рашэнні былі пранікнуты духам адзінства і непарыўнай сувязі камуністаў Беларусі з РКП(б).

Першы з'езд КП(б)Б вызначыў тэрыторыю Беларускай рэспублікі, падзяліўшы яе ў адміністрацыйна-гаспадарчых адносінах на 7 раёнаў—Мінскі, Смаленскі, Віцебскі, Магілёўскі, Гомельскі, Гродзенскі, Баранавіцкі і 53 падраёны (уезды). Пры рашэнні гэтага пытання ўлічваліся этнаграфічныя межы беларускай нацыі, а таксама эканамічныя і нацыянальныя асаблівасці губерняў і ўездаў, якія ўваходзілі ў састаў БССР.

Першы з'езд КП(б)Б прыняў «Палажэнне аб партыйных арганізацыях», якое выходзіла са Статута РКП(б). Яно ўключала пытанні работы Цэнтральнага Бюро Кампартыі Беларусі, райкомаў, падрайкомаў (ва ўездах) і ячэек (валасных і сельскіх); агітацыі і прапаганды, узаемаадносін партыйных органаў і Саветаў, абавязкаў камуністаў і іншыя пытанні партыйнага будаўніцтва.

Усе партыйныя органы будаваліся па прынцыпу дэмакратычнага цэнтралізму.

Першы з'езд Кампартыі Беларусі звярнуўся з заклікам да рабочых, батракоў, сялян і салдатаў. Звяртаючы ўвагу на падрыхтоўку імперыялістаў Амерыкі, Англіі, Францыі да аб'яднанага паходу супраць Савецкай краіны, з'езд заклікаў працоўных уступаць у рады Чырвонай Арміі, згуртавацца вакол Камуністычнай партыі ў барацьбе за сваю свабоду і незалежнасць.

З'езд выбраў кіруючыя органы КП(б)Б. У Цэнтральнае Бюро увайшлі А. Ф. Мяснікоў, В. Г. Кнорын, І. Я. Алібегаў, М. І. Калмановіч, Я. Ф. Перна, В. С. Селязнёў і іншыя. Старшынёй ЦБ КП(б)Б быў выбран А. Ф. Мяснікоў, сакратаром —В. Г. Кнорын.

Такім чынам, Першы з'езд Кампартыі Беларусі мае для беларускага народа вялікае гістарычнае значэнне. Ён завяршыў аб'яднанне ўсіх бальшавіцкіх арганізацый, існаваўшых на тэрыторыі Беларусі, і ўтварыў Камуністычную партыю Беларусі як састаўную і неад'емную частку Камуністычнай партыі Савецкай краіны, створанай вялікім Леніным. З'езд ажыццявіў спрадвечныя мары і спадзяванні беларускага народа, паклаў пачатак яго дзяржаўнасці, абвясціўшы на аснове ленінскай нацыянальнай палітыкі Беларускую Савецкую Сацыялістычную Рэспубліку — роўную сярод роўных савецкіх рэспублік.

Камуністычная партыя Беларусі, з'яўляючыся састаўной часткай КПСС, прайшла слаўны гераічны шлях. Пад кіраўніцтвам ЦК КПСС яна мабілізавала працоўных на разгром інтэрвентаў і ўнутранай контррэвалюцыі, правяла вялікую работу па стварэнню і ўмацаванню Беларускай Савецкай дзяржавы, згуртавала беларускі народ у стваральнай працы па пабудове сацыялізму, узначаліла ўсенародны вызваленчы рух у гады Вялікай Айчыннай вайны. Натхнёны Камуністычнай партыяй, беларускі народ у брацкай садружнасці з усімі народамі Савецкага Саюза хутка ліквідаваў цяжкія вынікі вайны і нямецка-фашысцкай акупацыі, дабіўся новага ўздыму ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі.

**А. ЦАРУК, дацэнт.**

# РЫХТУЙЦЕСЯ ДА АЛІМПІЯДЫ

## «СТУДЭНТ І НАВУКОВА-ТЭХНІЧНЫ ПРАГРЭС»

—пад такім дэвізам па рашэнню Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР і сакратарыята ЦК ВЛКСМ праводзіцца Усесаюзная алімпіяда. Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР, Бюро ЦК ВЛКСМ і прэзідыум Беларускага рэспубліканскага камітэта работнікаў асветы, вышэйшай школы і навуковых устаноў прынялі пастанову аб правядзенні першага і другога тура алімпіяды ў БССР.

Галоўныя задачы Усесаюзнай алімпіяды — мабілізацыя студэнтаў на авалоданне глыбокімі і трывалымі ведамі, марксісцка-ленінскім метадам пазнання, выхаванне ў іх любві да сваёй спецыяльнасці, імкненне да пастаяннага расшырэння светапогляду, развіццё навыкаў самастойнай работы.

Алімпіяда праводзіцца ў тры туры.

Першы тур ва універсітэце прадоўжыцца са снежня 1973 па сакавік 1974 года. Для арганізацыі і правядзення першага тура створан аргкамітэт пад старшынствам прарэктара па вучэбнай рабоце прафесара С. А. Умрэйкі.

У палажэнні аб алімпіядзе прадугледжваюцца:

— прадметныя алімпіяды;

— конкурсы па спецыяльнасці;

— агляд курсавых і дыпломных работ;

— агляд-конкурс вынікаў вытворчай практыкі.

**Прадметныя алімпіяды** праводзяцца па агульнанавуковых дысцыплінах. У іх могуць прымаць удзел студэнты ўсіх курсаў. Замежныя студэнты ўдзельнічаюць у алімпіядзе на агульных асновах.

Заданні распрацоўваюцца адпаведнымі кафедрамі і прадугледжваюць: праверку ведаў студэнтаў па тэарэтычных пытаннях, рашэнне задач, якія маюць практычнае значэнне, правядзенне эксперыментаў.

**Конкурсы па спецыяльнасці** праводзяцца сярод студэнтаў старэйшых курсаў аналагічна прадметным алімпіядам. Конкурсныя задачы распрацоўваюцца кафедрамі, на якіх вядзецца спецыялізацыя.

Пры падвядзенні вынікаў улічваецца падрыхтоўка студэнтаў па агульнанавуковых дысцыплінах, эканоміцы, навуковай арганізацыі працы і кіраванню вытворчасцю, а таксама ўменне выкарыстоўваць атрыманыя веды на практыцы.

**Агляд курсавых і дыпломных** работ арганізуюць кафедры, якія кіруюць гэтымі відамі вучэбнай работы.

Пераможцамі конкурсу лічацца студэнты, работы якіх выкананы па актуальнай тэматыцы, маюць арыгінальнае канструктарскае, тэхналагічнае рашэнне або навуковае значэнне, могуць быць выкарыстаны ў вытворчасці, атрымалі аўтарскія пасведчанні або апублікаваны ў друку.

Па выніках агляду аргкамітэт стварае выстаўку лепшых студэнцкіх работ і праектаў.

**Агляд-конкурс вынікаў вытворчай практыкі** праводзіцца кафедрамі, кіраўнікамі практыкі студэнтаў. Пры арганізацыі і правядзенні агляду-конкурсу прадугледжваюцца мерапрыемствы па прыцягненню студэнтаў да актыўнага ўдзелу ў вытворчай, навукова-даследчай і грамадскай дзейнасці калектываў прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый.

Удзельнікі першага тура алімпіяды, якія выканаюць заданне, узнагароджваюцца рэктаратам і грамадскімі арганізацыямі універсітэта. Пераможцы прадметных алімпіяд і конкурсаў па спецыяльнасці рашэннем аргкамітэта рэкамендуюцца для ўдзелу ў другім туры алімпіяды.

Другі тур праводзіцца ў Мінску ў красавіку — маі 1974 года ў рамках рэспубліканскага конкурсу пераможцаў першага тура алімпіяды, у якім прадугледжаны:

— конкурсы па спецыяльнасці;

— правядзенне алімпіяд па агульнанавуковых дысцыплінах.

На кожным факультэце пад старшынствам дэканаў факультэтаў ствараюцца аргкамітэты, якія праводзяць алімпіяды першага тура і прадстаўляюць інфармацыю аб удзеле студэнтаў у першым туры і спісы пераможцаў для ўзнагароджання і ўдзелу ў другім туры.

Задача дэканатаў, камсамольскіх і прафсаюзных арганізацый факультэтаў — прыняць неабходныя меры па прыцягненню ўсіх студэнтаў да актыўнага ўдзелу ва Усесаюзнай алімпіядзе, забяспечыць высокі навукова - метадычны і арганізацыйны ўзровень яе правядзення.

**В. ДАЛГАРУКАЎ,**
**намеснік старшыні аргкамітэта.**

# У РЭКТАРАЦЕ

Важнасць і неабходнасць правядзення грамадска-палітычнай практыкі і атэстацыі студэнтаў ужо ўсвядомлена добра, аднак практычны бок гэтай справы на розных факультэтах неаднолькавы. Таму ў панядзелак на пасяджэнні рэктарата быў абмеркаван ход правядзення грамадска-палітычнай практыкі і атэстацыі студэнтаў на філалагічным, юрыдычным і фізічным факультэтах. Дакладвалі дэканы тт. Волк, Чыгір, Зяцькоў.

Як высветлілася, работа ў гэтых напрамках нядрэнна вядзецца на філалагічным факультэце. Студэнты актыўна выступаюць з лекцыямі, дакладамі, удзельнічаюць у грамадска-палітычнай рабоце сярод школьнікаў і насельніцтва сельскай мясцовасці ў час вытворчай практыкі, у падшэфных арганізацыях.

Дакладна арганізавана грамадска-палітычная практыка на юрыдычным факультэце. Тут кожны студэнт атрымлівае канкрэтнае заданне і абавязкова дае справаздачу па гэтаму раздзелу практыкі. Прынцыпова, па-дзелавому прайшла атэстацыя будучых юрыстаў.

Горш справы на фізфаку. Калі аб грамадскай рабоце студэнтаў тут неяк клапаціліся, то да атэстацыі толькі прымерваюцца.

Слушныя заўвагі ў адрас фізфака, асобных яго кафедр былі выказаны загадчыкам вытворчай практыкі БДУ У. Д. Мухаевым. Ён прывёў прыклады, калі гэтая важная работа плануецца вельмі неканкрэтна, не вядзецца належны кантроль за гэтым бокам студэнцкай дзейнасці.

Пры абмеркаванні выказалі свае думкі, удакладнілі шэраг пытанняў, указалі на недахопы тт. Піскуноў, Браніцкі, Прахарэнка, Прылепка, рэктар БДУ т. Сікорскі і прарэктар т. Валадзько.

Былі абмеркаваны таксама магчымасці больш эфектыўнага выкарыстання вылічальнай тэхнікі ў вучэбным працэсе.

# УКАЗ ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

### Аб узнагароджанні тав. МАЛЫШАВА А. Я. ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БЕЛАРУСКАЙ ССР

За заслугі ў падрыхтоўцы кадраў, шматгадовую навукова-педагагічную дзейнасць і ў сувязі з шасцідзесяцігоддзем з дня нараджэння ўзнагародзіць прарэктара Беларускага дзяржаўнага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга універсітэта імя У. І. Леніна прафесара Малышава Андрэя Якаўлевіча Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

**Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР Ф. СУРГАНАЎ.**

**Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР Л. ЧАГІНА.**

12 снежня 1973 года.
гор. Мінск.



**НА ЗДЫМКУ:** група ўдзельнікаў савецка-польскага семінара кіраўнікоў маладзёжных арганізацый вышэйшых навучальных устаноў у адной з лабараторый фізічнага факультэта.

**Матэрыялы аб рабоце секцыі семінара ў нашым універсітэце глядзіце на другой старонцы.**

**26 снежня ў 17 гадзін у аўдыторыі № 206 (галоўны корпус) адбудзецца справаздачна-выбарная канферэнцыя групы народнага кантролю БДУ. Павестка дня: справаздача аб рабоце універсітэцкай групы народнага кантролю. Выбары новага саставу групы.**

**Рэгістрацыя дэлегатаў з 16.30.**

# НАКІРОЎВАЕМ, РАІМ

Сесія... Гарачая пара для студэнтаў. Менавіта ў гэтыя дні яны абагульняюць і паказваюць тыя веды, якія набылі ў семестры. Не за гарамі зімовая сесія першага семестра 1973-1974 навучальнага года.

— Як праходзіць падрыхтоўка да сесіі? — з такім пытаннем звярнуліся мы ў камітэт камсамола, прафбюро і дэканат геаграфічнага факультэта.

**Сяргей СУБОЦІН**, сакратар камітэта камсамола факультэта:

— Пачынаем з самых малодшых — першакурснікаў. Бо гэтая ж сесія самая першая ў іх жыцці. Акрамя экзаменаў па дысцыплінах, яны будуць трымаць складаны і адказны экзамен — экзамен на права называцца студэнтам.

Нядаўна на пасяджэнні бюро мы гаварылі аб падрыхтоўцы першакурснікаў да сесіі Прысутнічалі ўсе камсоргі, члены партбюро, куратары, выкладчыкі грамадскіх дысцыплін. Вырашана да 20 снежня правесці групавыя сходы, на якіх будуць прысутнічаць члены камітэта камсамола. На першым курсе такія сходы ўжо прайшлі.

**Пётр КРЭЙНІН**, старшыня прафбюро факультэта:

— На мінулым тыдні адбылося пасяджэнне прафбюро, на якім вырашалася пытанне аб правядзенні сесіі. Гаварылі аб абсталяванні пакояў для самападрыхтоўкі на факультэце і ў інтэрнаце. У іх будуць знаходзіцца геаграфічныя карты, натлядныя дапаможнікі, падручнікі, метадычная літаратура.

Вырашана сумесна з камітэтам камсамола ў кожнай групе на кожным курсе выпускаць «маланкі» аб ходзе здачы экзаменаў.

На аснове палажэння аб аглядзе-конкурсе на лепшую групу адразу пасля сесіі будуць падведзены вынікі і вызначаны лепшыя.

Працавалі мы ў цесным кантакце з камітэтам камсамола. Асноўная нагрузка ўскладаецца на вучэбна-вытворчы сектар.

**Георгій Якаўлевіч РЫЛЮК**, сакратар партыйнай арганізацыі факультэта:

— Нядаўна ў нас прайшоў партыйны сход «Задачы партыйнай арганізацыі факультэта па паляпшэнню якасці вучобы студэнтаў». На мінулым тыдні адбылося партыйнае бюро па пытаннях падрыхтоўкі да сесіі студэнтаў-завочнікаў. Звярнуў вялікую ўвагу на пытанне падрыхтоўкі да сесіі савет факультэта. Прайшоў сход куратараў з павесткай дня «Аб паляпшэнні вучобы студэнтаў». Трымаем сувязі з камсамольскай і прафсаюзнай арганізацыямі. Накіроўваем, арыентуем, раім.

**Н. НОВІКАВА.**
**(Прэс-цэнтр камітэта камсамола).**

## АД СЕСІІ ДА СЕСІІ...



# ПЕРАД ПЕРШЫМ «БАР'ЕРАМ»

Надыходзіць адказная пара для студэнтаў—сесія. Таму ў аўдыторыі можна пачуць размовы аб заліках і экзаменах, аб тым, што ў некага «гарыць» рэферат...

Часта наведвае сваіх студэнтаў куратар першай групы Валерый Мікалаевіч Шэін: хвалюецца за сваіх выхаванцаў.

Каб не адбылося недарэчнасцей у час экзаменаў, патрэбна дапамагчы першакурснікам разабрацца ў шэрагу пытанняў. Так, у групе пры дапамозе Валерыя Мікалаевіча вывучана палажэнне аб правядзенні зімовай экзаменацыйнай сесіі, адбылася сустрэча з выдатнікамі вучобы факультэта Мікалаем Дзянісавым і Людай Бадзічка. Яны расказалі аб сваім метадзе падрыхтоўкі да сесіі, адказалі на хвалюючыя першакурснікаў пытанні.

**М. ЖУРАВОВІЧ,**
**студэнт I курса**
**факультэта**
**журналістыкі.**

# НА МОВЕ ДРУЖБЫ

Амаль тыдзень ва універсітэце працавала секцыя савецка-польскага семінара кіраўнікоў маладзёжных арганізацый вну. У яе рабоце прынялі ўдзел група польскіх таварышаў пад кіраўніцтвам загадчыка аддзела Галоўнага праўлення Сацыялістычнага саюза польскіх студэнтаў Ляшэка Яскевіча, а таксама сакратары камсамольскіх арганізацый універсітэтаў нашай краіны: Маскоўскага, Казанскага, Гомельскага, Казахскага, Ерэванскага і іншых.

Былі гутаркі, дыскусіі, абмен вопытам, а галоўнае, — была вялікая цеплыня і сардэчнасць адносін.

**ДЗЕНЬ ПЕРШЫ**

Ён пачаўся ўрачыстай сустрэчай у вестыбюлі галоўнага корпуса. Дзяўчаты ў нацыянальных касцюмах уручаюць Ляшэку Яскевічу духмяны беларускі каравай. Затым — знаёмства з універсітэтам: кафедрамі, лабараторыямі, бібліятэкай і спартыўнай залай. Госці захапляліся ўбачаным. Ужо потым, у прыватнай гутарцы, адзін з іх — Юзэф Міхальскі, старшыня Кракаўскага праўлення ССПС — прызнаўся мне, што больш за ўсё яго ўразіла тое, якія выдатныя ўмовы створаны савецкім студэнтам для вучобы і адпачынку. «Вы шчаслівыя людзі», — сказаў ён.

Пра пастаноўку вучэбнай і навуковай работы ў БДУ ўдзельнікам семінара расказалі прарэктар па навуковай рабоце Л. В. Валадзько, намеснік сакратара парткома В. І. Пракошын, сакратар камітэта камсамола У. Наумовіч і адказны за работу акадэмічнага сектара камітэта камсамола Р. Янчылік.

У ходзе дыскусіі абмяркоўваліся: савет выдатнікаў, работа з адстаючымі, значэнне падрыхтоўчых курсаў на грамадскіх пачатках, работа па гаспадарчых дагаворах і іншыя пытанні.

**ДЗЕНЬ ДРУГІ**

Сёння будуць абмяркоўвацца пытанні ідэйна-палітычнага выхавання студэнтаў. Да пачатку работы яшчэ ёсць час, і мы з Крысцінай Швідэр блукаем па бясконцых калідорах хімічнага корпуса. Дзяўчына расказвае пра сябе. І не важна, што яна не ведае па-руску, а я па-польску, мова дружбы — самая зразумелая.

Крысціна — студэнтка V курса гісторыка-філасофскага факультэта Познаньскага універсітэта. Спецыялізуецца па сацыялогіі. Не так даўно яна была выбрана намеснікам старшыні Познаньскага праўлення ССПС.

Другі секцыйны дзень адкрыў намеснік сакратара парткома В. І. Пракошын. Ён расказаў аб вялікай ролі камсамола для жыццядзейнасці такой вялікай вну, як наш універсітэт, аб рабоце камуністаў з камсамольцамі.

Плённа для абодвух бакоў прайшло абмеркаванне планавання выхаваўчай работы, а таксама правядзення вучобы камсамольскага актыву. Аб ходзе Ленінскага заліку гасцям расказалі намеснік сакратара камітэта камсамола БДУ У. Сілін, намеснік сакратара камсамольскай арганізацыі геафака Л. Смолік, камсамолец А. Лукашанец.

Рамана Падшвядэку, прадстаўніка Люблінскага праўлення ССПС, і Андрэя Шульца з Гданьскага універсітэта асабліва цікавіць пытанне арганізацыі СБА. Яны прапанавалі наладзіць абмен атрадамі паміж БДУ і польскімі вну.

З расказам аб жыцці і вучобе польскіх студэнтаў выступіў Уладзімеж Цімашэвіч — старшыня вузаўскага праўлення ССПС Варшаўскага універсітэта.

**ДЗЕНЬ ТРЭЦІ**

Структура камсамольскай арганізацыі універсітэта, хуткасць праходжання інфармацыі ад камсамольскага бюро універсітэта да групы, работа універсітэцкай газеты — гэтыя і іншыя пытанні абмяркоўваліся сёння.

На сустрэчу, акрамя асноўнай групы, прыйшлі: загадчык студэнцкага аддзела ЦК ВЛКСМ Б. Намеснікаў, першы сакратар ЦК ЛКСМБ У. Падрэз, намеснік Галоўнага савета Федэрацыі ССПС Эўдэній Мельцарэк і сакратар Галоўнага савета Федэрацыі Анджэй Еж.

У ходзе дыскусіі было закранута цікавае пытанне: падрыхтоўка юнакоў і дзяўчат да ўтварэння маладой сям'і. Размова ішла аб маральным выхаванні, прадастаўленні маладым сем'ям інтэрната, аб спецыяльным цыкле лекцый і г. д.

Закончыўся дзень сардэчнымі выступленнямі гасцей.

**ДЗЕНЬ АПОШНІ**

Калі я спытала ў Анджэя Бэлькі, намесніка праўлення ССПС у г. Лодзі, што яму больш за ўсё спадабалася ў нас, ён адказаў:

— Тры рэчы: універсітэт, поспехі ў палітычнай рабоце, рух студэнцкіх будаўнічых атрадаў.

У актавай зале універсітэта — удзельнікі семінара, работнікі ЦК камсамола, выкладчыкі, студэнты. Яны, людзі розных нацыянальнасцей, гавораць на розных мовах, але ў іх адны мэты і задачы.

Абмен сувенірамі і падарункамі. Вялікі канцэрт мастацкіх калектываў універсітэта.

Мы сядзім з Ляшэкам Яскевічам побач, і ён не перастае захапляцца танцамі «Крыжачка»:

— Цудоўна! Бардзо цудоўна! Кожны танец — псіхалогія вашага народа, выдатнага рускага народа.

**Л. ПЕРАСЫПКІНА.**
**(Прэс-цэнтр камітэта камсамола).**

**На здымках:**
**Дарагім гасцям — хлеб-соль!**
**Адзін з момантаў работы секцыі.**

**Фота М. ХАМЦА.**





СТУДЭНЦКІ ІНТЭРНАТ

# ХАЙ БУДЗЕ РОДНЫМ ДОМАМ

Гаварыць аб тым, што інтэрнат студэнта—другі дом, напэўна, не трэба — ніхто не будзе гэта аспрэчваць. Але час ставіць новыя праблемы, бо ўзбагацеў духоўны свет студэнта, рэзка ўзрос яго інтэлектуальны ўзровень. У інтэрнаце цяпер студэнт хоча не толькі чытаць, рыхтавацца да заняткаў, але і мець магчымасць паслухаць музыку, паглядзець тэлеперадачу, сустрэцца з цікавымі людзьмі, паспрачацца, пагутарыць.

Давайце зойдзем у адзін з інтэрнатаў, паглядзім, якія ўмовы там для жыцця, вучобы і адпачынку. Наведаем гісторыкаў. Іх інтэрнат, што на вуліцы Свярдлова, лічыцца адным з лепшых.

На працягу ўсяго рэйду нашымі гідамі і расказчыкамі былі намеснік старшыні студсавета Віктар Сілін і Святлана Манастырская, стараста трэцяга паверха.

Першае, што кінулася ў вочы, — чысціня ў калідорах і вестыбюлі, акуратна аформленыя стэнды, справаздачы санкамісіі. Не менш двух разоў у месяц выходзіць газета. Час ад часу з'яўляецца «Маланка» — гэта і віншаванні студэнтаў з днём нараджэння, і спецыяльныя выпускі.

Здаўна павялося гаварыць аб студэнцкім інтэрнаце: «Гудзе, як пчаліны вулей». Так, на самай справе. Бо ў пакоі жыве 4 чалавекі. Людзі розных узростаў, інтарэсаў, духоўных запатрабаванняў. Аднаму хочацца паглядзець «Семнаццаць імгненняў вясны», другому падабаецца «Італьянскае капрычыо» Чайкоўскага, і ён уключыў радыёлу, трэці захапляецца Шэрлакам Холмсам і таму чытае дэтэктыў Канан-Дойля, а чацвёртаму так патрэбна сканцэнтраваць сваю ўвагу на падрыхтоўцы да практычных заняткаў. І як не проста падпарадкаваць свае інтарэсы агульным!

І нельга не зазначыць, што тут умеюць адпачываць і працаваць. Хаця ў інтэрнаце жыве каля 400 студэнтаў, не пачуеш шуму, гаму.

Пераважная колькасць пакояў у строгім парадку. І 91, і 74... У 89-м, дзе жывуць дзяўчаты з III курса, утульна і чыста. На ложках—акуратна засланыя пакрывалы, падушкі ўзбіты так, як зрабіць гэта могуць толькі дзяўчаты. Асаблівую ўтульнасць надаюць featured рознакаляровыя дыванчыкі, аконныя шторы. Аднак шторы сустрэнеш не ў кожным пакоі: дзяўчаты купілі іх у складчыну. Мусіць, можна было паклапаціцца аб тым, каб забяспечыць усе пакоі шторамі. Не перашкодзілі б яны і на дзвярах (як, напрыклад, на Бабруйскай).

Ленінскі пакой. Ён ніколі не пустуе. Надвячоркам прыходзяць сюды паглядзець тэлевізійныя перадачы, пагаварыць.

Збіраюцца тут і ў больш урачыстых выпадках: сустрэча з цікавымі людзьмі. Нядаўна гасцямі студэнтаў былі прадстаўнікі філармоніі. У бліжэйшы час запланавана сустрэча з артыстамі тэатра.

Хоць Святлана і Віктар, як сапраўдныя патрыёты роднага інтэрната, стараліся паказаць нам станоўчыя бакі інтэрнацкага быту, мы не маглі не заўважыць, што ў некаторых пакоях першага паверха падлога абшарпана, фарба даўным-даўно аблезла, па не зусім зразумелай прычыне няма на тумбачках сурвэтак, рэдка дзе ўбачыш на стале графін і шклянку. Справы па добраўпарадкаванню інтэрната спакваля рухаюцца наперад. Але членам студсавета трэба быць больш рухавымі. Новы студсавет (13 чалавек) пастанавіў праводзіць кожны месяц конкурс на лепшы пакой. Хутка пройдзе першы семестр, а наконт падвядзення вынікаў нічога не чуваць.

Былі нараканні на работу душа: павінен ён адкрывацца не з 12 гадзін, а з самай раніцы. Але, мабыць, трэба згадзіцца з Віктарам Сіліным, што цяперашні парадак задавальняе большасць студэнтаў, бо раніцай усе ідуць на заняткі. У час сесіі не хапае месцаў у чытальнай зале. Тут парада адна — займацца ва універсітэцкіх чытальных залах, гарадскіх бібліятэках, як робяць студэнты з іншых універсітэцкіх інтэрнатаў.

І апошняе — буфет. Па словах Святланы Манастырскай, працаваць то ён працуе, але вось асартымент страў адзін і той жа. А студэнту для эканоміі часу вельмі неабходны добры буфет.

**Рэйдавая брыгада:**
**С. ГАРБУЗАВА, Т. КУЛАГІНА, Н. ДЗЯДЗЮК, В. ГІРУЦЬ, В. ЛАПЦІК.**

**КАЛЕКТЫЎ І Я**

# ПА ЯКОМУ ПРАВУ?

Для чалавека адчуванне адзіноты заўсёды пакутлівае. Аказацца ў такім цяжкім стане можа не толькі той, хто жыве на бязлюдным востраве альбо ў глухім лесе. Можна знаходзіцца сярод людзей і быць адзінокім. Гісторыя ведае прыклады, калі вялікія людзі былі незаслужана пакараны неразуменнем іх поглядаў сучаснікамі. Але тут размова пойдзе не пра іх, а пра студэнта нашага універсітэта.

У IV групе першага курса беларускага аддзялення філфака 25 чалавек. І 23 з іх настроены супраць свайго таварыша па вучобе Уладзіміра Ягоўдзіка. Аб пазіцыі дваццаць чацвёртага, Жэні Цумарова, трэба гаварыць асобна. Што гэта? Абуральнае ганенне генія? Не. Ягоўдзік выступае не ў ролі пакрыўджанага, а ў ролі крыўдзіцеля. Ён сам вінават у тым, што сябры адвярнуліся ад яго.

Усё пачалося з вераснёўскіх сельскагаспадарчых работ. Студэнты-першакурснікі атрымлівалі першае «хрышчэнне». Ужо тады Ягоўдзік «праявіў» сябе. У групе ўсяго пяць юнакоў, астатнія—дзяўчаты. І ён «па-рыцарску» ўступаў ім месца на асабліва цяжкіх участках работы. Не скупіўся і на знявагі.

Аднойчы прыйшоў на кухню. Там ужо сядзела некалькі дзяўчат. Не дагадзілі яны яму. Вось і аблаяў ён адну, а ў другую, калі тая паспрабавала абараніць сяброўку, кінуў талерку з гарачай стравай.

Яму аб'явілі байкот. Але гэта Уладзіміра не вельмі хвалявала. Любе Сільвановіч, камсоргу групы, у парыве шчырасці ён прызнаўся:

— Усе яны мне не патрэбны. Я выберу сабе некалькі сяброў, а на астатніх—напляваць.

Такой «прывілеі» былі ўдастоены Тоня Хатэнка і яшчэ некалькі «выбраных». Ён чытаў ім свае вершы, цікавіўся іх літаратурнымі вопытамі. Хваліўся многімі публікацыямі (а сапраўды аказалася, што надрукавана некалькі яго вершаў у раённай газеце), знаёмствамі з многімі вядомымі паэтамі рэспублікі. Сцвярджаў, што без «сувязей» ніхто з рабят не даб'ецца выхаду на старонкі газет і часопісаў, і прапаноўваў ім сваю дапамогу. Гэтыя погляды Ягоўдзіка абуралі таварышаў. Узнікалі спрэчкі. І кола яго сяброў звужалася.

Затым пачаліся заняткі. Ягоўдзік прадаўжаў выдасканальвацца ў новых знявагах. Больш за ўсё ён любіў паўтараць: «Вы не дастойныя мяне!» Цяпер гэта адносілася і да адступнікаў, былых сяброў.

Неяк перад заняткамі па іспанскай мове Уладзімір прапанаваў адной з дзяўчат сесці з ім побач за стол. А пасля званка «пажартаваў»: «Наогул, ты не дастойна сядзець побач са мной, але што ж, сядзі!» Дзяўчына пакрыўдзілася, але перасесці не было куды —усе месцы ў аўдыторыі заняты. А ў час заняткаў яна атрымала заўвагу адносна дрэннага адказу. І на перапынку паміж лекцыямі Ягоўдзік крычаў на ўвесь калідор, паказваючы на яе пальцам:

— Глядзіце, вось самая дурная ў нашай групе па іспанскай мове!

Так ён гаварыў пра дзяўчыну, якая прапусціла некалькі заняткаў з-за таго, што ездзіла дадому да вельмі хворай маці. Крыўдзіць лёгка, а вось дапамагчы чалавеку—аб гэтым Ягоўдзік не падумаў.

Хутка пасля гэтага захварэў выкладчык лацыні. Заняткаў не было, і група вырашыла правесці няпланавы камсамольскі сход. Вельмі ўжо многа накапілася пытанняў, якія патрабавалі тэрміновага вырашэння. Сабраліся ў свабоднай аўдыторыі. Не было толькі Ягоўдзіка і яго адзінага з некатарага часу сябра Жэні Цумарова. Прыйшлося ісці да іх пасыльнаму з асабістым запрашэннем. Нарэшце яны з'явіліся. Ягоўдзік адразу ж вымавіў:

— Хто мяне выклікаў? Ты ці хто будзе са мной размаўляць?—дадаў ён, звяртаючыся да Раі Савінскай.

І тады цярпенне групы лопнула. Усе пачалі выказваць свае крыўды.

— Хто б гаварыў, але толькі не ты, трапло! — кідае ён адной з дзяўчат.

Гэта рэпліка абурыла ўсіх. Камсорг Люба Сільвановіч патрабавала:

— Ты член нашага калектыву і павінен паважаць нас як людзей, як дзяўчат!

На гэта Ягоўдзік са знявагай адказаў:

— Каго паважаць? Вы мяне не корміце, не поіце, не апранаеце, матэрыяльна я ад вас не залежу. Таму вы не маеце права мяне духоўна перавыхоўваць.

Цяпер у групе з Ягоўдзікам амаль не размаўляюць. Усіх вельмі пакрыўдзіла яго высакамернасць і самаўлюбёнасць. Усіх, акрамя Цумарова, хоць у недалёкім мінулым і ён абураўся паводзінамі Уладзіміра. Але цяпер яны зблізіліся. Прычына гэтага, як пераканаyны многія, — «радства душ», бо Цумароў падобны да свайго сябра, толькі больш сціплы. Іншыя лічаць, што яго зачаравалі «сувязі» сябра.

Так і жыве Ягоўдзік. Шмат часу ён знаходзіцца ў калектыве, з таварышамі па вучобе. І сцяна адчужэння, якая ўстае паміж імі, вельмі перашкаджае групе. Рабятам вельмі хочацца яе разбурыць. Хвалюе і лёс таварыша. Але што рабіць? Трэба, каб гэтае жаданне ўзнікла ў самога Ягоўдзіка. Вінаваты — умей адказаць. Пакрыўдзіў — значыць, заслужы прабачэнне. Але ён пакуль не робіць крокаў да прымірэння. Напэўна, не ўсвядоміў, не разумее сваёй віны.

А як жа ён будзе жыць далей? Наперадзе ж яшчэ амаль пяць гадоў вучобы з таварышамі, якіх ён незаслужана пакрыўдзіў, зняважыў. А якім жа настаўнікам, педагогам ён стане ў будучым? Чаму зможа навучыць школьнікаў?

Напэўна, аб гэтым варта сур'ёзна падумаць.

**І. ЯКАЎЛЕВА.**

# ПАЕЗДКА Ў КІЕЎ

Будаўнічы атрад «Верасок» філалагічнага факультэта, які працаваў летам на меліярацыі ў Бярэзінскім БМУ, заняў першае месца ў Барысаўскай зоне. За добрасумленную працу кіраўніцтва БМУ прэміравала СБА «Верасок» паездкай у Кіеў.

У снежні вераскоўцы пабывалі ў сталіцы Савецкай Украіны, адным з прыгажэйшых гарадоў краіны.

У Кіеве студэнты наведалі ВДНГ, Дзяржаўны музей Т. Р. Шаўчэнкі, былі ў Сафійскім саборы (помнік архітэктуры XI ст.) і ў Кіева-Пячэрскай лаўры, зрабілі экскурсію па гораду, усклалі кветкі да магілы Невядомага салдата.

Знаёмства з Кіевам — «маці гарадоў рускіх» было вельмі прыемным і карысным.

**М. ЗУЕЎ,**
**студэнт філфака.**

# ...І ЗАХАПЛЕННЕ

Удзел у гуртках пры кафедрах для многіх студэнтаў геафака не проста форма навуковай работы, а захапленне. Тут яны прывучаюцца рабіць асабістыя назіранні і вывады. А летнія экспедыцыі і падарожжы даюць ім шмат цікавых і незабыўных уражанняў.

Члены гуртка вядуць даследаванні па тэмах, распрацаваных кафедрамі. Так, напрыклад, большасць дакладаў, заслуханых у гуртку эканамічнай геаграфіі СССР, прысвечаны праблемам, якія адлюстроўваюць вытворчую практыку студэнтаў. Гэта — вывучэнне зямельных рэсурсаў і іх дынамікі, геаграфіі галін раслінаводства і жывёлагадоўлі, прамысловасці і насельніцтва.

Адна з тэм кафедры і гуртка фізічнай геаграфіі СССР — «Уплыў меліярацыі на ландшафты і мікраклімат Беларускага Палесся». На пасяджэннях гуртка былі заслуханы даклады студэнтаў і супрацоўнікаў, якія прымалі актыўны ўдзел у даследаваннях асаблівасцей сельскагаспадарчага выкарыстання ландшафтаў Прыпяцкага Палесся, мікраклімату г. Мінска і інш.

30 студэнтаў займаецца ў гуртку «Глебазнаўца». Тэмы іх дакладаў прысвечаны экспедыцыйным даследаванням. Нярэдка перад гуртоўцамі выступаюць супрацоўнікі Беларускага НДІ глебазнаўства і аграхіміі, вядомыя вучоныя іншых рэспублік. Нядаўна цікавы даклад зрабіў дацэнт Кіеўскага дзяржаўнага універсітэта В. І. Гаўрылюк.



Другі кірунак работы гуртка — знаёмства са спецыяльнай літаратурай і перыядычнымі выданнямі. У гэтым студэнтам дапамагаюць іх выкладчыкі: прафесар В. А. Дзяменцьеў, прафесар А. Х. Шкляр, дацэнт В. П. Бардзіна, кандыдат геаграфічных навук Н. І. Жураўская і іншыя.

Па выніках мінулага года гурток эканамічнай геаграфіі СССР заняў III месца ва універсітэце. А навуковая работа І. Пірожніка атрымала І катэгорыю на рэспубліканскім аглядзе-конкурсе.

**Т. РАМАНАВА.**
**Н. ДЗЯЛЕНДЗІК.**
**І. ЧАРТОК.**

На пасяджэнні навуковага гуртка выступае студэнт IV курса Дзмітрый Міцкевіч.

Фота Н. Жураўскай.



# ПАТРАБУЕ РАШЭННЯ

**РЭЙД «Беларускага УНІВЕРСІТЭТА»**

Мы ў шматпавярховым будынку інтэрната № 7, дзе жыве 1500 студэнтаў розных факультэтаў: фізічнага, матэматычнага, філалагічнага, а таксама замежныя студэнты.

Прадстаўнікі розных факультэтаў... Гэта акалічнасць ускладняе работу як каменданта і яго намесніка, так і студэнцкага савета. Штодзень паўстаюць усё новыя праблемы. Іх трэба рашаць. Як жа гэта робіцца?

Пачнем, як кажуць, з самага пачатку. На «вахце», пры ўваходзе ў інтэрнат, дзве дзяўчыны з філалагічнага факультэта. Ветлівыя, яны далікатна патрабавалі ад кожнага, хто заходзіў, прад'явіць пэўны дакумент. Адным дапамагалі знайсці каменданта, гасцям—патрэбны пакой. Словам, абавязак свой выконвалі добра.

Усё ішло як мае быць, як раптам у дзверы... уварваўся хлопец...

— Ваш пропуск? — запыталі ў адзін голас дзяўчаты.

Твар хлопца скрывіўся, нібы ён толькі што глынуў нечага вельмі кіслага. Кінуўшы ў адказ зняважлівы позірк, не вымаючы з зубоў цыгарэту, ён упэўнена прайшоў у цэнтральны хол, строс попел на зеляніну.

...Затым падышоў да скрыні з пісьмамі, працягваючы курыць.

— Вы ведаеце гэтага чалавека? — звярнуліся разгубленыя студэнткі да хлопцаў, якія сталі побач. У адказ раздаўся дружны смех... І прагучаў ён як адабрэнне толькі што зробленага ўчынку студэнта фізічнага факультэта.

На афармленне хола студсавет затраціў шмат сродкаў, працы і часу. І ўзнікае пытанне: як жа можна такім чынам ставіцца да таго, што зроблена рукамі тваіх жа таварышаў? Дзе ж прызнакі хаця б элементарнай культуры!

У пакоі студсавета мы сустрэліся з камендантам Барысам Жыдзецкім.

На жаль, пэўнага адказу на пытанні, колькі камісій уваходзіць у склад студсавета, якія яны, хто ўзначальвае, мы не атрымалі. На нашу думку, камендант павінен гэта ведаць, і ведаць добра. Як жа тады кіраваць, з каго спытаць, калі не ведаеш, хто чым займаецца, за што адказвае. Больш таго, каменданту спатрэбіўся час, каб адшукаць у спісе нумар пакоя «сваёй правай рукі»—старшыні студсавета, студэнта трэцяга курса фізічнага факультэта Мар'яна Місюка.

З самага пачатку размовы стала зразумела, што Мар'ян тут на сваім месцы. Ён не стаў пералічваць зробленага, а сказаў, што «вострых момантаў» куды больш. Да іх у першую чаргу аднёс дысцыпліну студэнтаў, выхаванне культуры паводзін, санітарны стан пакояў, афармленне паверхаў, холаў, актавай залы.

— У студсавеце — 28 чалавек, у асноўным гэта студэнты фізічнага і матэматычнага факультэтаў. Збіраемся раз у месяц. Але бюро студсавета, у склад якога ўваходзяць старшыні важнейшых камісій, праводзіць пасяджэнні штотыдзень і рашае бягучыя справы.

На мінулым тыдні слухалі справаздачу студэнта фізічнага факультэта Мікалая Катовіча аб рабоце інтэрнацыянальнай камісіі, якая была арганізатарам сустрэч з замежнымі студэнтамі, сумесных вечароў адпачынку, спартыўных спаборніцтваў.

Жыллёва-бытавую і персанальную камісіі ўзначальваюць студэнты-фізікі Міхаіл Ткачоў і Аляксандр Міхайлоўскі. Члены камісій прынцыпова падыходзяць да тых, хто парушае парадак жыцця ў інтэрнаце, утрымлівае пакой у антысанітарных умовах. Менавіта за гэта былі пазбаўлены месц у інтэрнаце студэнты фізічнага факультэта Валерый Ціцавец, Ларыса Федарава, Аляксандр Александровіч, Аляксандр Вайцюк. Многія атрымалі папярэджанні і вымовы.

Умела вядзе работу культурна-масавая камісія, якую ўзначальвае студэнтка фізічнага факультэта Таццяна Патупчык.

Куды горш абстаяць сёння справы ў камісіі па афармленню, якую ўзначальваюць матэматыкі Фёдар Аргер і Павел Макуцэвіч. Зараз ідзе рамонт. Чаму б не выкарыстаць гэта для афармлення паверхаў?

Адказныя, пэўна, чакаюць канца рамонту?

Але ж ён вядзецца такімі тэмпамі, што канца пакуль не відаць. Не дайшлі яшчэ рукі і да ленінскага пакоя, актавай залы.

У чым жа прычына? Можа, не хапае матэрыялаў, дрэнная матэрыяльная дапамога? Не. Зусім наадварот. Дэканат фізічнага факультэта пастаянна падтрымлівае са студсаветам сувязь. Намеснік дэкана дапамог прыдбаць усё неабходнае: і фотаматэрыялы, і стэнды, і фарбы. Справа, як бачым, толькі за самімі студэнтамі, за іх жаданнем хутчэй зрабіць інтэрнат больш прыгожым.

Выклікае неспакой дзейнасць ідэйна-выхаваўчай камісіі, у склад якой уваходзіць (адзін!) чалавек—студэнт фізічнага факультэта Пётр Шых. Што ж ён можа зрабіць адзін у інтэрнаце, дзе пражывае паўтары тысячы чалавек?!

Студсавету ў самы кароткі тэрмін неабходна перагледзець становішча спраў на гэтым участку работы.

І, бадай, самае балючае месца — утрыманне пакояў і паверхаў у належных санітарных умовах. Ніякай скідкі на тое, што ідзе рамонт, не можа быць, бо нават там, дзе ён даўно ўжо скончыўся, засталося шмат бруду. Задача санітарнай камісіі не толькі ў тым, каб падаваць у персанальную камісію спіс на высяленне. Трэба часцей рабіць санітарныя праверкі, падключыць у работу «Камсамольскі пражэктар», які апошні раз выйшаў вельмі і вельмі даўно.

Здзівіў і той факт, што адказныя за дзейнасць камісій — у асноўным студэнты фізічнага факультэта. У студсавеце побач з камсамольцамі мала працуе камуністаў.

Спадзяемся, што ўсе недахопы, выяўленыя ў выніку рэйду, будуць улічаны і ліквідаваны.

**Рэйдавая брыгада:**

**Т. КРАСІКАВА,**
**А. ФЯДОТАВА,**
**С. БЯЗРУЧКА,**
**У. БАРЫСЕНКА.**




# ...ТАКІМ ЖА ДРУЖНЫМ

*У гэты вечар у корпусе філфака сабраліся прадстаўнікі розных пакаленняў турыстаў і альпіністаў клуба. І нельга было ўтрымацца ад спакусы — задаць ім некалькі пытанняў. Такіх, напрыклад:*
*1. Які паход (узыходжанне) пакінуў найбольшае ўражанне?*
*2. Ваша «крышталёвая мара»: дзе хацелася б пабываць, куды схадзіць?*
*3. Клубу 15 год. А якім вы бачыце яго ў будучым?*
*Вось як на іх адказалі.*

**Ю. ВЕЛЬТНЕР,** журналіст, у клубе 6 год.

1. Алтай, 1968 год. Паход IV катэгорыі складанасці. Усё было новае, усё было нялёгкае, усе былі братамі...
2. Мару пабываць на Паўночным полюсе.
3. Жывым...



**А. РАГОТНЕР,** студэнт IV курса фізфака, альпініст-першаразраднік.

1. Вяршыня Гестала. Гэта ўзыходжанне (па найбольш простаму маршруту) на Безенгійскую сцяну, якая лічыцца сімвалам непрыступнасці. І прыгажосці...
2. Пік Перамогі.
3. Гэта нялёгкае пытанне. Калі коратка, то клуб у будучым — гэта тое, дзе табе рады і ты рад усім.

Ветэраны, чый турысцкі стаж роўны ўзросту клуба — **А. С. Фядэнка, А. М. Люцко, М. Е. Неменман** і іншыя,— вырашылі адказаць на пытанні анкеты разам.

1. Усё яшчэ наперадзе...
2. Усё роўна куды, але з нашай «старой» групай.
3. Адказ на пытанне — гэты малюнак.




**В. ЛАПАТКА,** студэнт II курса фізфака, у клубе 1,5 года.

1. Паход мінулага лета. Самы цікавы таму, што адбылася першая сустрэча з гарамі. Прайшлі чатыры перавалы. Непагадзь два дні трымала пад Джалпаколам. Для мяне гэты перавал тым больш цікавы, што прайшлі яго ў дзень майго нараджэння. На маршруце сустракаліся з турыстамі з усіх куткоў Саюза...
2. Эльбрус. Пажадана вышэй «Прыюта II»
3. Такім жа дружным, цікавым...

**Т. СЕНЧЫК, А. ХОЛУПАВА.**

# КТА: ДЗЕНЬ МІНУЛЫ, ДЗЕНЬ СЁННЯШНІ

Год 1973 — удалы для альпіністаў універсітэта. Спіс заваяваных вяршынь павялічыўся на добрую паўсотню назваў. Секцыя, якая вырасла літаральна ў апошнія гады, з'яўляецца цяпер вядучай у ДСТ «Буравеснік» і адной з самых шматлікіх у горадзе. Гэты рост абумоўлен не толькі прыходам новых сіл кожнай восенню, але і тым, што ветэраны, выпускнікі БДУ, не парываюць сувязь з секцыяй.

Аднак поспехі клуба вымяраюцца не адной масавасцю. У першую чаргу звяртае ўвагу рост майстэрства спартсменаў. Калі раней альпініст-разраднік у секцыі быў рэдкасцю, то цяпер у яе складзе спартсмены з III, II і I разрадам і нават інструктары. Выхаванцы секцыі Г. Кісялёў, Я. Ціткін, М. Яўменчыкаў выдатна закончылі Усесаюзную школу інструктараў альпінізму.

У гэтым годзе сезон, як заўсёды, пачаўся ў маі. Разраднікі сустрэлі яго ў цясніне Адыр-Су на Каўказе, дзе правodзілі 10-дзённыя зборы. Група альпіністаў на скалах у раёне Жытоміра адпрацоўвала скальную тэхніку, удзельнічала ў спаборніцтвах па скалалазанню. Летам усіх чакалі альпіністкія лагеры, горныя паходы. Група разраднікаў на чале з трэнерам секцыі, кандыдатам у майстры спорту Э. Брэгманам ажыццявіла некалькі ўзыходжанняў на Паміры (Фанскія горы) ў складзе спартыўных збораў ДСТ «Буравеснік». Гэта былі, як правіла, узыходжанні IV і V катэгорыі складанасці.

Сезон не заканчваецца з прыходам восені. Трымаецца той спартыўны настрой, тая дружба, што па-новаму ўспыхнула ў час узыходжанняў і паходаў.

Восень — час злётаў, час сустрэч. Стала традыцыяй кожны год сустракаць у клубе ганаровага члена альпінісцкай секцыі БДУ, вядомага савецкага альпініста, заслужанага майстра спорту Я. Р. Аркіна, яго сяброў па шматлікіх узыходжаннях і проста вельмі цікавых людзей. Кожная такая сустрэча — падзея не толькі для універсітэцкага клуба, але і для альпіністаў усяго горада.

Калі працягваць размову аб традыцыях, то варта ўспомніць і яшчэ адну разнавіднасць сустрэч. Не аднойчы члены клуба былі гасцямі розных школ горада Мінска. Школьнікі з надзвычайнай цікавасцю слухалі ўспаміны аб узыходжаннях, паходах, аб альпінізме — нялёгкім і мужным спорце. Расказы заўсёды суправаджаліся дэманстрацыяй каляровых пазітываў, фотаздымкаў.

У планах клуба — новыя вяршыні. Новыя паходы, новыя перамогі. А яны немагчымы без доўгіх, настойлівых трэніровак. І таму два разы ў тыдзень сустракаюцца спартсмены ў спартыўнай зале, а па нядзелях — у ваколіцах Крыжоўкі і Зялёнага.

**А. ЗАЛАН.**



Крок у крок.



Наперад і ўверх.

# ЗАМАЛЁЎКІ З ВЕЧАРА

Гэтую старонку падрыхтавалі **Т. Засім** і **Г. Кісялёў.**

### ЗЛЁТ АДКРЫТ

Таму, хто трапіў на гэты вечар выпадкова, было непрывычна і дзіўна. Незвычайнымі былі і праграма вечара — без традыцыйных урачыстых прамоў і рэгламенту, і людзі — маладыя той зайздроснай вечнай маладосцю апантаных, і настрой — нечаканы, пры такой колькасці удзельнікаў, настрой адзінства...

— Просьба да ўсіх былых старшынь клуба, якія прысутнічаюць тут: падніміцеся, калі ласка, на сцэну...

На сцэне рознаўзроставы строй, своеасаблівая гісторыя клуба. І быццам не ў зале, а на просеках Вязынкі або Крыжоўкі ўзнімаецца сцяг клуба. Юбілейны злёт адкрыт....

### З ВЫСТУПЛЕННЯЎ

**А. С. Фядэнка,** доктар матэматычных навук, першы старшыня турклуба БДУ:

— Мяне абвінавачваюць у тым, што ў апошні час адышоў ад спорту. Але ўпэўнен, што не дабіўся б у матэматыцы поспехаў, калі б у свой час не атрымаў той зарад, які даюць складаныя паходы.

**А. М. Люцко,** кандыдат фізіка-матэматычных навук, у клубе 15 год:

— Гісторыя нашага клуба —гэта гісторыя развіцця турызму і альпінізму не толькі ва універсітэце, але ва усёй рэспубліцы. У канцы 50-х гадоў, калі клуб толькі нарадзіўся, беларускіх турыстаў і альпіністаў можна было пералічыць на пальцах. Цяпер нас — тысячы, аматараў нялёгкіх і цікавых дарог...

Ад імя ветэранаў усяго адно настаўленне: перадольваючы паходныя цяжкасці, вучыцеся пераадольваць жыццёвыя, глядзіце на іх з вышыні вяршыні, адкуль не відаць прыкрых дробязей.

### СТАРАЖЫТНЫЯ ...ЮНЫЯ

Мэта імітаванага КВЗ— адказаць на пытанні: якім быў клуб, якім ён стаў, якім будзе?

Каманд было чатыры. «Старажытная, старая, маладая і юная» — тут жа з гумарам былі яны названы. Адпаведна ў іх увайшлі прадстаўнікі чатырох пакаленняў універсітэцкіх турыстаў і альпіністаў — тыя, хто закончыў БДУ больш як тры гады назад, нядаўнія выпускнікі, сённяшнія студэнты (члены клуба — разраднікі) і будучае клуба, са стажам ўсяго год-паўтара.

Пераможцамі аказаліся «Старажытныя ветэраны». М. Е. Неменман абгрунтаваў невыпадковасць гэтай перамогі:

— Каманда павінна была выйграць. Па-першае, па ачках (1/2 каманды ў акулярах). Па-другое, каманда амаль уся складаецца з кандыдатаў і дактароў навук. Па-трэцяе — ...як старыя і нямоглыя, мы ўпаўне заслужылі паблажлівасць...

### ПОМНІШ!

«А люди идут по свету...»

Сёння яны ідуць па былых маршрутах ва ўспамінах. Кінафільмы, дыяпазітывы, фотаздымкі, песні вярнулі кожнага ў свае Браславы, Карпаты, на Урал, Каўказ, якія былі аднойчы і непаўторна, але сёння ўспомніліся. І песня гучыць тая ж, і недзе тут, у зале, тая ж група...

«Опять я Баксаном
Любуюсь, как сказкой...»

І ўсё ж усю ўрачыстасць, незвычайнасць і значнасць моманту, калі ў зале загучалі песні, па-сапраўднаму маглі, напэўна, ацаніць толькі тыя, хто гэтыя ж песні спяваў ля кастра, ў палатцы, Гітара магічна сцягвала вакол сябе круг.

«Ой, горы, вы синие
горы...»

Сцэна была пустой і лішняй у гэтай зале...

Праз некалькі дзён на вуліцы выпадкова падслухала размову:

— У суботу на філфаку такі вечар быў! Клубу турыстаў і альпіністаў 15 год... Думалі: ат, нешта звычайнае... А там — КВЗ, свой спектакль, фільмы, у антракце — чай... І людзі такія... Ім так цікава жыць!

**Т. ОЛЬГІНА.**

# ДЛЯ ВАС, ФІЛОЛАГІ!

## У ВЫДАВЕЦТВЕ «ВЫШЭЙШАЯ ШКОЛА» ВЫЙШЛІ НАСТУПНЫЯ КНІГІ:

Ахрыменка П. П. Тарас Шаўчэнка і Беларусь. 1969. Ц. 70 к.
Беларуская літаратура XIX стагоддзя. Хрэстаматыя, 1971. Ц. 74 к.
Булахаў М. Г. Практыкаванні і матэрыялы па курсу гісторыі беларускай мовы. 1969. Ц. 29 к.
Гурскі М. І. Параўнальная граматыка рускай і беларускай моў. 1972. Ц. 80 к.
Камароўскі Я. М. Беларуская мова. Арфаграфія. 1972. Ц. 56 к.
Клюсаў Г. Н., Аляксеенка Г. І. Зборнік дыктантаў павышанай цяжкасці. 1970. Ц. 63 к.
Клюсаў Г. Н., Юрэвіч А. Л. Сучасная беларуская пунктуацыя. 1972. Ц. 76 к.
Лявончыкаў Н. Е. Беларуская рэтраспектыўная бібліяграфія кніг. 1971. Ц. 14 к.
Макарэвіч А. А. Кароткі літаратуразнаўчы слоўнік. 1969. Ц. 43 к.
Налівайка А. М., Бурэйка Т. А. Беларуская літаратура. 1971. Ц. 94 к.
Песні сямі вёсак. (Традыцыйная лірыка Міншчыны). Пад рэд. Н. Гілевіча. 1973. Ц. 83 к.
Ралько І. Д. Беларускі верш. 1969. Ц. 72 к.
Саламевіч Я. Міхаіл Федароўскі. 1973. Ц. 1 р. 47 к.
Усікаў Я. К. Беларуская камедыя. 1973. Ц. 1 р. 22 к.
Цікоцкі М. Я. Стылістыка публіцыстычных жанраў. 1971. Ц. 57 к.
Чыгрын І. П. Станаўленне беларускай прозы і фальклору. 1971. Ц. 91 к.
Янкоўскі М. А. Паэтыка беларускіх прыказак. 1971. Ц. 76 к.
Янкоўскі Ф. М. Роднае слова. 1972. Ц. 60 к.

# ПАКЛАПАЦІЦЕСЯ АБ ЗДАРОЎІ

Студэнты часта звяртаюцца да нас са скаргамі на моцныя галаўныя болі, дрэннае запамінанне вывучаемых прадметаў, трывожны сон. Пазбегнуць гэтых непрыемных з'яў можна пры правільным рэжыме дня.

Добры вынік дае актыўны адпачынак — змена разумовай працы фізічнай. Заняткі абавязкова трэба чаргаваць з адпачынкам і прытым актыўным—спартыўнымі трэніроўкамі, хадзьбой на лыжах, бегам на каньках і прагулкамі. Правільна адпачываць не менш важна, чым правільна працаваць.

Аб рэжыме дня студэнта мы ўжо пісалі. Набліжаецца сесія, і хочацца напомніць аб некаторых важных палажэннях. Асаблівую ўвагу трэба звярнуць на харчаванне (яно павінна быць рэгулярным і паўнацэнным) і сон. Вельмі шкодна займацца па начах. Спаць трэба не менш 8 гадзін. Лепшы час для сну з 23 да 7 гадзін.

**А. НІСНЕВІЧ,**
**урач.**

Рэдактар А. А. НІКОЛЕНКА.

«Белорусский университет»—орган парткома, ректората, месткома, комитета комсомола и профкома Белорусского ордена Трудового Красного Знамени государственного университета им. В. И. Ленина. На белорусском языке.

Тыраж 2000 экз.
Газета выходзіць па чацвяргах.
Аб'ём — 1 друк ар.

Наш адрас: г. Мінск. Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.
Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

АТ 20710 Зак. 1534.